**Мальцава Лідзія Васільеўна,**
*дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага» (Рэспубліка Беларусь)*

## ГРОДЗЕНСКАЯ АБЛАСНАЯ НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Я.Ф.КАРСКАГА: ДВА СТАГОДДЗІ ГІСТОРЫІ

Гісторыя галоўнай кніжніцы Гродзенскай вобласці непарыўна звязана з лёсам Прынёманскага краю, яго народа.

17 верасня 2010 года ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага» спаўняецца 180 гадоў з дня заснавання. Першая публічная бібліятэка на Беларусі мае цікавую гісторыю.

Матэрыялы архіваў сведчаць, што рашэнне аб яе адкрыцці было прынята ў верасні 1830 года на нарадзе высокапастаўленых асобаў у гарадзенскага губернатара Міхаіла Трафімавіча Бабяцінскага.

Падставай для яго сталі «Цыркуляры...» міністра ўнутраных спраў Расіі А.А.Закрэўскага з указаннем адкрыць губернскія бібліятэкі. Дабравольнымі ахвяраваннямі дваране горада падтрымалі ідэю стварэння такой важнай, на іх погляд, установы.

Першапачаткова бібліятэчным фондам карысталіся ўсяго 40 чытачоў, з іх: «правасхадзіцельстваў» - 2, «высокаблагародных» - 17, «благародных» - 21.

Каб падтрымаць існаванне бібліятэкі, гарадзенскі губернатар прапанаваў усім служачым горада ахвяраваць на яе патрэбы адзін працэнт ад месячнага заробку. На сабраныя такім чынам грошы былі выпісаны перыядычныя выданні і закуплены кнігі *(некалькі дзясяткаў экз.)*. Усе, хто ўдзельнічаў у аб'яўленай акцыі, мелі права карыстацца бібліятэкай бясплатна, а астатнія маглі стаць чытачамі толькі за плату.

З 1877 года бібліятэка пачынае атрымліваць урадавую субсідыю ў памеры 800 рублёў у год.

Фонд публічнай бібліятэкі ў 1895 годзе налічваў ужо амаль 8 тысяч экзэмпляраў, ім карысталіся каля 6 тысяч чалавек.

З Гарадзенскай публічнай бібліятэкай цесна звязаны лёс высокаадукаваных цікавых людзей, якія ўнеслі значны ўклад у яе развіццё: першым бібліятэкарам быў назначаны Міхаіл Зялёнка, прарэктар





гімназіі, сябар вялікага ўкраінскага паэта Тараса Шаўчэнкі; у склад Праўлення ўваходзіў вядомы даследчык гісторыі Гродна Я.Ф.Арлоўскі; у 1892 годзе бібліятэку ўзначаліў бацька славутага паэта Максіма Багдановіча - Адам Ягоравіч, вучоны, педагог і грамадскі дзеяч. Ён аўтар «Каталога русским и иностранным книгам Гродненской ... публичной библиотеки».

Да 1917 года Гродзенская абласная навуковая бібліятэка прайшла наступныя этапы:

1 этап (1830-1854 гг.) - арганізацыйны. Бібліятэка была даступна вузкаму колу асоб з дваранства і чыноўнікаў, яе фонд налічваў некалькі сотняў кніг.

2 этап (1854-1863 гг.) - доступ да публічнай бібліятэкі атрымалі розныя колы насельніцтва. Абслугоўванне было платным, таму для бедных слаёў насельніцтва яна заставалася недасягальнай.

3 этап (1863-1917 гг.). У гэты перыяд прагрэсіўная інтэлігенцыя горада спрабуе пашырыць дзейнасць бібліятэкі, хаця значных поспехаў у гэтай справе не дасягае.

Пасля ўстанаўлення савецкай улады на Гродзнешчыне публічная бібліятэка аб'яднала фонды многіх ліквідаваных устаноў горада. Гэта былі каштоўныя і цікавыя кнігі і рукапісы, у 1924 годзе іх налічвалася 28 тысяч тамоў.

У 30-я гады, калі Гродзеншчына знаходзілася ў складзе Польшчы, бібліятэка дзейнічала і як павятовая цэнтральная. Сістэматычна працавалі самаадукацыйна-бібліятэчныя курсы, на якіх навучаліся бібліятэкары з гмінных бібліятэк у Азёрах, Эйсмантах, Верцялішках, Гожы і г.д.

1 мая 1940 года адбылося ўрачыстае адкрыццё бібліятэкі для шырокіх працоўных мас. Кнігі пачалі выдавацца чытачам бясплатна. Цяга да ведаў шырокіх мас насельніцтва ўплывала на працу бібліятэкі. У 1940 годзе кніжны фонд павялічыўся да 35 тысяч экзэмпляраў, а колькасць чытачоў дасягнула 4-х тысяч. Кожны дзень бібліятэку наведвалі 400-450 чытачоў, а чытальную залу - 150-170. Яна стала месцам цікавых сустрэч, гутарак, вечароў.

Трагічнымі для бібліятэкі былі гады Вялікай Айчыннай вайны. Усяго за гады вайны бібліятэка страціла 35 тысяч экзэмпляраў кніг. Толькі невялікую колькасць бібліятэчнага фонду ўдалося захаваць былому супрацоўніку Мікалаю Аляксандравічу Чарвякоўскаму.

Праз дзесяць дзён пасля вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў бібліятэка пачала працаваць. Нягледзячы на цяжкія ўмовы існавання, ажыццяўлялася выдача кніг, а чытальная зала была перапоўнена.

За тры гады даваенная дзейнасць бібліятэкі аднавілася і расшырылася.

У канцы 40-х - 50-х гадах арганізоўваюцца бібліятэкі-перасоўкі ў межах горада і на перыферыі. Праводзіцца навуковая работа, складаецца сістэматычны каталог на ўвесь фонд, адкрываецца міжбібліятэчны абанемент (МБА), наладжваецца метадычная дапамога бібліятэкам Гродзеншчыны, штогод рыхтуецца 10-15 работнікаў для раённых і сельскіх бібліятэк вобласці.

15 лютага 1957 года бібліятэцы прысвоена імя першага беларускага акадэміка, заснавальніка беларускай філалогіі і мовазнаўства Я.Ф.Карскага.

З кожным годам аўтарытэт бібліятэкі ў грамадстве расце.

Шмат увагі ў рабоце ўдзялялася краязнаўчай дзейнасці, збору і сістэматызацыі матэрыялаў па гістарычнай і культурнай спадчыне ўсіх нацыянальных супольнасцяў Гродзеншчыны. Праводзіліся цыклы лекцый па праблемах навукі, тэхнікі, мастацтва, сустрэчы са знакамітымі людзьмі.

На буйнейшых прадпрыемствах і будоўлях горада арганізоўваліся дні інфармацыі з тэматычнымі праглядамі літаратуры, непасрэдна на вытворчасці афармляліся кніжна-ілюстрацыйныя выставы.

У верасні 1980 года калектыў бібліятэкі за плённую працу быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Наступныя гады - гэта перыяд станаўлення абласной бібліятэкі як інфармацыйнага, культурнага і метадычнага цэнтра вобласці.

У сучасны перыяд ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага» з'яўляецца буйнейшым кнігасховішчам, вядучым інфармацыйным, адукацыйным і сацыяльна-культурным цэнтрам, лідарам бібліятэчнай палітыкі ў вобласці.

Штогод бібліятэкай карыстаецца амаль 44 тыс. чытачоў: навукоўцы, творчая інтэлігенцыя, спецыялісты народнай гаспадаркі, моладзь, дзеці і інш. Ім выдаецца 800 тыс.экз. дакументаў. Штодзённа аддзелы бібліятэкі наведваюць звыш 900 жыхароў вобласці.

Багаты ўніверсальны фонд, які налічвае 640 тыс. дакументаў, складаюць кнігі, часопісы (800 назваў), газеты (250 назваў); (абласная газета «Гродзенская праўда» захоўваецца з 1945 г., раённыя газеты - з 50-х гадоў), грампласцінкі, дыяфільмы, відэакасеты, электронныя дакументы на беларускай, рускай і замежных мовах.





Мастацкая і галіновая сусветная літаратура прадстаўлена на беларускай, рускай, англійскай, нямецкай, французскай, польскай, літоўскай мовах, даведкавыя выданні - на 45 мовах свету.

За апошняе дзесяцігоддзе фонд бібліятэкі папоўніўся важкім набыткам. Гэта - манаграфія Я.Арлоўскага «Гродненская губерния» (Гродна, 1910), «Православный Софийский собор в гор.Гродно» (Гродно, 1907), «Акты, издаваемые комиссиею, высочайше учрежденною для разбора древних актов в Вильно. Т.1. Акты Гродненского земского суда» (Вильно, 1865) і інш.

У фондзе бібліятэкі знаходзіцца адзінае ў Гродзенскай вобласці факсімільнае выданне «Радзівілаўскі летапіс» (СПб, 1994), які напісаны ў канцы XV ст.

Апошнія паступленні ў фонд краязнаўчых дакументаў міжваеннага перыяду - «Обзор народного хозяйства Польши» (Варшава, 1927), «Яўрэі на Беларусі» (Менск, 1930), «Grodno» (Grodno, 1934) і інш.

Захоўваецца калекцыя старадаўняй мастацкай і гістарычнай літаратуры XIX-XX ст.ст., якая ўключае прыжыццёвыя выданні Э.Ажэшкі, Б.Пруса, Г.Сянкевіча, Ю.Славацкага, Ч.Дзікенса, А.Дзюма, Дж.Эліота.

У аддзеле мастацтва, сярод унікальных запісаў, захоўваюцца дакументальныя запісы ваенных гадоў: радыёзварот Сталіна да савецкага народа 3 ліпеня 1941 года; паведамленні імфармбюро, агучаныя Левітанам, у тым ліку рэпартаж пра падпісанне акта аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі, фрагменты рэпартажаў пра парад Перамогі 1945 года на Краснай плошчы ў Маскве, выступленні і ўспаміны военачальнікаў, удзельнікаў бітваў. Запісы ваенных песень у выкананні М.Бярнэса, К.Шульжэнкі, Л.Зыкінай і інш.

Актыўна ўкараняюцца ў практыку работы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

Камп'ютарны парк абласной бібліятэкі налічвае 109 машын. Аўтаматызаваны ўсе бібліятэчныя працэсы: шлях кнігі ад яе заказу да выдачы чытачу. Праводзіцца алічбоўка музычных дакументаў.

Электронны каталог ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага» адлюстроўвае 99% усяго фонду. Баз дадзеных уласнай генерацыі - 12, сярод іх: бібліяграфічныя - «Мастац-

тва», «Гродзенская вобласць», «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка«, «Дзіцячая літаратура», паўнатэкставая «Памяць Гродзеншчыны» і іншыя.

Для наведвальнікаў у чытальных залах бібліятэкі абсталяваны 30 аўтаматызаваных рабочых месцаў, 27 з іх - з выхадам у Інтэрнэт.

У цэнтры ўвагі - людзі з аслабленым зрокам. Для іх выдзелены фонд, створаны рабочыя месцы.

Працуе Віртуальная чытальная зала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якая забяспечвае чытачам доступ да сусветных інфармацыйных рэсурсаў.

Доступ карыстальнікаў да прававой інфармацыі забяспечвае ПЦПІ *(Публічны цэнтр прававой інфармацыі).* З 2003 года пры бібліятэцы працуе Грамадская прыёмная, дзе бясплатную юрыдычную дапамогу чытачам аказваюць юрысты-практыкі юрыдычных службаў горада.

У аддзеле мастацтва і дзіцячым філіяле дзейнічаюць мультымедыйныя цэнтры, а на базе юнацкага філіяла створаны інфармацыйна-адукацыйны цэнтр (у доміку, дзе раней жыла сусветна вядомая пісьменніца Э.Ажэшка), які дазволіў пашырыць спектр бібліятэчных паслуг з выкарыстаннем сучасных тэхналогій і захаваннем лепшых традыцый. Працуюць курсы па вывучэнні замежных моў. Абсталявана камп'ютарнай і праектнай тэхнікай зала для правядзення канферэнцый, семінараў, адкрытых лекцый і ўрокаў.

Супрацоўнікі юнацкага філіяла і аддзела выданняў на замежных мовах праводзяць экскурсіі для суайчыннікаў і замежных гасцей па мемарыяльным пакоі, прысвечаным жыццю і творчасці Э.Ажэшкі.

У Доміку на працягу 9 гадоў збірае творчых людзей літаратурны салон «У пані Элізы», для дзяцей-сірот праводзяцца навагоднія святы каля елкі, дабрачынныя акцыі.

Сваю дзейнасць калектыў бібліятэкі каардынуе з грамадскімі і дзяржаўнымі арганізацыямі, установамі і творчымі саюзамі. За год праводзіцца звыш 250 мерапрыемстваў. Сярод іх: навукова-практычныя канферэнцыі, прэзентацыі кніг і творчыя сустрэчы з удзелам пісьменнікаў Гродзеншчыны і краіны, літаратурныя вечарыны, інфармацыйныя тыдні, дні інфармацыі, віктарыны і конкурсы, гадзіны цікавых паведамленняў і гутаркі, экскурсіі.

Пры бібліятэцы працуюць 4 літаратурныя аб'яднанні: «Литературные четверги» (25 гадоў), «Нябесны знак», які аб'ядноўвае паэтаў





і пісьменнікаў Гродзеншчыны (10 гадоў), салон «У пані Элізы» (9 гадоў), дзіцячы - «Почитай-ка» (6 гадоў).

Вялікая ўвага надаецца духоўна-маральнаму выхаванню моладзі на аснове хрысціянскіх каштоўнасцяў. На працягу апошніх 7 гадоў гэтаму садзейнічае плённае супрацоўніцтва з Гродзенскай епархіяй, установамі адукацыі і медыцыны, праваахоўнымі органамі. Сумесна рэалізаваны дабрачынная праграма «У справы добрыя ўкладзі ўсё лепшае сваёй душы», марафон маральнасці, дабра і здароўя «Жыццё вартае таго, каб жыць».

Лагічным працягам стала дабрачынная праграма «З надзеяй у будучыню», распрацаваная на 2008-2010 гг., мэта якой - аказанне падтрымкі і дапамогі сацыяльна неабароненым дзецям і падлеткам.

Глыбокаму пазнанню гісторыі роднага краю і выхаванню пачуцця гонару за яго садзейнічае цыкл «Гарадзенскія чытанні»: Першыя прысвячаліся 230-годдзю «Газеты Гродзеньскай»; 880-годдзю г.Гродна - Другія і Трэція, у полі зроку якіх былі «Археалагічныя даследаванні ў Гродне», «Гісторыя Гародні ў асобах» і інш.; 240-годдзю Гродзенскага тэатра Тызенгаўза - Чацвёртыя.

Аддзел мастацтва бібліятэкі стаў яшчэ адной выставачнай залай у горадзе. Праводзяцца выставы работ мастакоў, майстроў дэкаратыўна-прыкладного мастацтва, творчых саюзаў, калекцыянераў, ладзяцца творчыя сустрэчы, майстра-класы і іншыя мерапрыемствы.

У межах «Недели белой трости» арганізавана выстава работ інвалідаў па зроку пад назвай «Я ўсё магу…», якая стала сапраўдным святам: чытачы з аслабленым зрокам прадстаўлялі свае працы, зробленыя з бісеру, скуры, саломы, паперы і г.д., чыталі вершы, спявалі песні.

Вялікую цікавасць у гродзенцаў выклікала выстава макетаў і праектаў самых значных архітэктурных аб'ектаў Гродзеншчыны абласной арганізацыі «Беларускі саюз архітэктараў» - «Партитура застывшей музыки».

Каштоўным з'яўляецца тое, што побач з экспанатамі дэманструюцца лепшыя выданні з фондаў бібліятэкі, якія раскрываюць канкрэтны від мастацтва, дапамагаюць моладзі паспрабаваць сябе ў творчасці.

Бібліятэка выконвае 30 відаў платных паслуг, ад якіх у мінулым годзе атрымана 33 тыс.даляраў.

ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Кар-

скага» з'яўляецца метадычным цэнтрам для бібліятэк вобласці: аказвае метадычную і практычную дапамогу, праводзіць мерапрыемствы па павышэнні кваліфікацыі, абагульняе і ўкараняе перадавы вопыт бібліятэчнай працы, займаецца выдавецкай дзейнасцю.

Адным з галоўных накірункаў метадычнай дзейнасці абласной бібліятэкі з'яўляецца навукова-даследчая работа. За апошнія гады праведзены даследаванні: «Стан і перспектывы развіцця інфармацыйных патрабаванняў чытачоў абласной бібліятэкі», «Цэнтральная бібліятэка як метадычны цэнтр рэгіёна», «Паслугі абласной бібліятэкі», «Социальные причины сиротства: мнение молодежи».

Штогод бібліятэка выдае 20 творчых прац, сярод іх: бібліяграфічны паказальнік «Новая літаратура аб Гродзенскай вобласці», разгорнуты аналітычны матэрыял з дадаткамі (статыстычныя табліцы) «Бібліятэкі Гродзеншчыны за ... год»; штоквартальны інфармацыйны бюлетэнь «З жыцця бібліятэк вобласці»; інфармацыйны зборнік «У дапамогу метадысту»; тэматычныя рэкамендацыйныя паказальнікі па мастацтве; «Краязнаўчы каляндар» і інш.

Сёння ў бібліятэцы працуе высокапрафесійны творчы калектыў. Штат налічвае 124 чалавекі, з іх 80 - бібліятэчныя спецыялісты, 70 з якіх маюць вышэйшую адукацыю.

За добрасумленную працу і значны ўклад у сацыяльна-культурнае жыццё грамадства калектыў бібліятэкі мае шмат узнагарод, сярод якіх - Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровая грамата Савета Міністраў, Пісьмо-падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і інш. Па выніках работы за 2008 год калектыў стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва ў намінацыі «Бібліятэчная справа».